

Каму слова — жывое?

Народны літаратурны студэнцкі тэатр БДПУ імя М. Танка — з'ява сапраўды ўнікальная — дастаткова нават учытацца ў фармулёўку, каб зразумець гэта. Нягледзячы на юбілей — паўстагоддзя, адзначаныя ў мінулым годзе, і саліднае званне «народны» — студэнцкая гарэзлівасць у прыярытэце. Кацярына Захарэвіч сустрэлася з кіраўнікамі тэатра Алесяй Сівохінай і Алесем Мойскім, якія расказалі, навошта студэнтам тэатр, а тэатру — студэнты.

— Як вы пазнаёміліся з тэатрам?

Алеся Сівохіна: Гэта было ў 2001 годзе. Тут займалася мая сяброўка, і аднойчы яна мне сказала: «Што ты марнуеш час? Ты ж так спяваць хочаш». Я вучылася тады на першым курсе і вырашыла сапраўды паспрабаваць. Вось так мяне і зацягнула.

Спачатку думак, што я буду тут кіраўніком, у мяне не было. Проста так склаўся лёс. Як я зараз разумею, з тэатрам можна працаваць да пэўнай ступені развіцця. Далей развіваешся ці ў іншы бок, ці ў той бок на новай ступені. І так склалася, што я са ступені акцёра студэнцкага тэатра пачала развівацца як рэжысёр і потым — як кіраўнік.

Алесь Мойскі: Я ў 2007-м паступіў на факультэт беларускай філалогіі і культуры БДПУ і з самага пачатку цікавіўся ўсімі праявамі студэнцкага жыцця. Хлопцаў на нашым курсе філфака было мала, але мы былі лідарамі студактыву, прафсаюзу, выпускалі газету «Студэнт(-ка)», якая аднойчы заняла 2-е месца на рэспубліканскім конкурсе «Зімовая школа студэнцкай журналістыкі». Я быў галоўным рэдактарам, і мы часта пісалі пра «Жывое слова», а ідэю стварыць мужчынскую газету на жаночым факуль-

тэце падкінуў мой аднагрупнік Леанід Падукоў, які першым прыйшоў і ў літаратурны тэатр. Яму доўга клікаць мяне не давялося, і на наступную рэпетыцыю мы прыйшлі разам, калі адбываўся традыцыйны штогадовы набор першакурснікаў у «Жывое слова».

— Што ўваходзіць у абавязкі кіраўніка тэатра?

Алеся Сівохіна: З 2012 года абавязкі кіраўніка дзялю з Алесем Мойскім. Мы робім усё: пачынаючы ад набору акцёраў і да саміх пастановак. Першапачатковая ініцыятыва, канцэпцыя таго ці іншага спектакля сыходзіць ад нас. Дэкарацыі, музыка — самі ці з дапамогай студэнтаў.

Жанчыне адной цяжка кіраваць. Тэатр — сям'я, а калі жанчына кіруе тэатрам без мужчыны, гэта няпоўная сям'я. Мы з Алесем адно аднаго дапаўняем не толькі ў кіраванні, у падыходзе да калектыву, але і ў творчасці: ён здольны прыдумаць рэчы, якія я ўвогуле не магу ўявіць. Часам, наадварот, я кажу яму, што прыдумала, а ён гаворыць: «Я разумею, пра што ты, але не ведаю, як гэта ўвасобіць». Вось так мы дапаўняем адно аднаго.

Алесь Мойскі: Мы разумеем вялікую адказнасць за тых, каго прыручылі. Удасканальваем свае веды, праводзім трэнінгі і майстар-класы. Не запаўняем пазавучэбны працэс, а вучым і вучымся самі. Галоўнае: мы любім тое, чым займаемся, у нас гараць вочы, і са студэнтамі мы абменьваемся гэтым полымем. А калі ёсць ўзаемазапаленчы працэс, то не даводзіцца шмат часу аддаваць дысцыпліне. Студэнты самі раяцца з намі пра тое, што іх хвалюе, дзеляцца праблемамі, якія складана патлумачыць бацькам ці звычайным выкладчыкам. Мы сапраўды адна сям'я, і на рэпетыцыях разам займаемся не толькі любімай справай, але і святкуем дні народзін удзельнікаў тэатра, Каляды, Новы год, Дні роднай мовы і абаронцаў Айчыны, вясновае свята жанчын і іншыя.

— Якія лёсавызначальныя падзеі ў гісторыі тэатра вы маглі б вылучыць?

Алеся Сівохіна: Самая першая лёсавызначальная падзея — гэта сустрэча Андрэя Андрэевіча Каляды і Фёдара Міхайлавіча Янкоўскага. Янкоўскі прапанаваў Калядзе, які на той момант быў акцёрам Купалаўскага тэатра, стварыць гурток выразнага чытання. Магчыма, я зараз крыху фантазірую, бо любая гісторыя — у нейкай ступені наша фантазія. Напачатку гэта быў тэатр выразнага чытання для будучых педагогаў, каб яны навучыліся валодаць словам, каб слова ў іх вуснах было жывое, каб яны абуджалі і запальвалі агонь энтузіязму ў сваіх вучнях. Гэтая ідэя не страчвае актуальнасці ніколі. Яна развілася і перайшла ў тэатр — культурна ўнікальную беларускамоўную з'яву.

Алесь Мойскі: Лёсавызначальных падзей было шмат за 50-гадовую гісторыю тэатра. Вось хоць бы 1977 год, калі тэатр чытальнікаў «Жывое слова» атрымаў званне Народнага, а гэтай вясной мы ў чарговы раз пацвердзілі ганаровую назву. Унікальнай была з'ява харавога чытання,

Калі ёсць ўзаемазапаленчы працэс, то не даводзіцца шмат часу аддаваць дысцыпліне





Мяняліся падыходы і формы працы, спектаклі і дэкарацыі, але сутнасць заставалася — мы заўжды скіраваныя на развіццё асобы ў рэчышчы беларускай культуры, захавання традыцый і мовы. Мы імкнемся быць актуальнымі, нам уласцівы эксперымент і наватарства, але гэта адбываецца пад дэвізам, добра акрэсленым аднойчы Рыгорам Барадуліным: «Жыць словам!»

прыўнесеная на сцэну студэнцкага тэатра Андрэем Калядой. Важнай была кожная вандроўка тэатра па ўсім Савецкім Саюзе, а пасля — з'яўленне «Жывога слова» на тэлебачанні ў праграме «Беларуская літаратура ў школе». Лёсавызначальнымі былі змены на пасадзе кіраўнікоў тэатра: Андрэй Андрэевіч перадаў эстафету сваім вучням Юрасю і Алене Чарэнкам, а яны — Наталлі Кухаравай…

Для мяне лёсавызначальным быў 46-ы тэатральны сезон, калі, здавалася, цікавасць да тэатра знікае, у калектыве заставалася 6 чалавек, мяне самога чакаў напярэдзе выпуск з універсітэта і, я меркаваў, з тэатра. Але прэм'еру нашага спектакля «Афарызм», знітаванага з твораў Уладзіміра Караткевіча, давялося паказваць двойчы запар. Уваход быў вольны, і глядзельная зала не змясціла ўсіх жадаючых пачуць жывое слова, і мы папрасілі палову гледачоў вярнуцца праз гадзіну. Сцерлі з ілба пот, набралі паветра і паказалі спектакль другі раз. Такім чынам, я адчуў запатрабаванасць таго, што мы робім, колькі б нас ні было, і застаўся ў тэатры падчас навучання ў магістратуры, аспірантуры і зараз сумяшчаю любімае хобі з асноўным месцам працы ў Белтэлерадыёкампаніі.

— Куды, на вашу думку, рухаецца тэатр увесь той час, што вы кіруеце?

Алеся Сівохіна: Тэатр у дынаміцы ад самага пачатку. Канешне, кожны кіраўнік прыносіць новае ўяўленне, новую карцінку, якім павінен быць тэатр. Без канцэпцыі і свайго разумення вельмі складана нешта зрабіць. У нас гэтая карцінка адбудавалася. Мы прыйшлі да таго, што канцэртныя выступленні і спектаклі для нас — не мэта, а сродак удасканальвання для нашых студэнтаў. Яны прыходзяць абсалютна розныя, са сваімі думкамі. Яны не акцёры і хочуць кожны рознага. Тое, што мы разам рыхтуемся да спектакляў, выступаем — гэта і ёсць сродак. З дапамогай гэтага сродку мы робімся лепшымі — кожны ва ўласным разуменні.

Алесь Мойскі: Сакрэт даўгалецця тэатра ў тым, што «Жывое слова» не змяняе сваім прынцыпам — рухаецца ў кірунку, закладзеным яшчэ Андрэем Калядой. Мяняліся падыходы і формы працы, спектаклі і дэкарацыі, але сутнасць заставалася — мы заўжды скіраваныя на развіццё асобы ў рэчышчы беларускай культуры, захавання традыцый і мовы. Мы імкнемся быць актуальнымі, нам уласцівы эксперымент і наватарства, але гэта адбываецца пад дэвізам, добра акрэсленым аднойчы Рыгорам Барадуліным: «Жыць словам!»

— Як трапіць да вас у тэатр?

Алеся Сівохіна: Напачатку ў нас ёсць прагляд. Мы просім расказаць пра сябе, патлумачыць, чым зацікавіў тэатр, а яшчэ — прачытаць, праспяваць ці станчыць, каб мы пачулі голас, маўленчыя асаблівасці, зразумелі, як далей праца-

ваць. Кастынгу ў нас няма: мы нікому не кажам: «Ты нам не патрэбны», а з радасцю працуем з тымі, хто хоча працаваць.

Калі пачынала я, то «першагодак» было шмат, каля пятнаццаці чалавек, а выпускаліся мы з тэатра ўчацвярых. Некаторыя прыходзяць на больш позніх курсах, але выпускаем мы іх усё адно на апошнім, таму што з працай пачынаецца іншае жыццё. Звычайна выпускаюцца 2-4 чалавекі, але ў гэтым годзе выпускнога ўвогуле не будзе, бо наш калектыў зараз — студэнты 1-3 курсаў.

Алесь Мойскі: Зараз даведацца пра тэатр можна не толькі праз перыядычны друк, радыёстанцыі, гасцямі якіх мы часта з'яўляемся, але і праз інтэрнэт-прастору. Нашы суполкі «Жывое Слова» & кампанія» ёсць у сацыяльных сетках, дзе ўвесь час абнаўляецца інфармацыя пра набор у тэатр і ўсе нашы выступленні.

Раскажу таксама пра ўласны вопыт, як на першым курсе да прагляду я падрыхтаваў ўласныя вершы. Да таго часу ўжо адбыўся мой паэтычны дэбют у часопісе «Бярозка», і вершы, надрукаваныя ў ім у школьныя гады (2005—2006), я прачытаў упершыню са сцэны тэатра, распавёў колькі слоў пра сябе, хоць мне гэта не проста далося, бо беларускую мову я ведаў з дзясятка прачытаных кніг, а мае бацькі, аднакласнікі і сябры заўсёды размаўлялі па-руску. Аднак тагачасныя кіраўнікі «Жывога слова» Наталля Кухарава і Уладзімір Трапянок, відаць, заўважылі маё жаданне авалодаць мовай і ўзялі ў тэатр, хоць, прызнаюся, не раз па-юнацку крыўдаваў, калі яны мяне неаднаразова папраўлялі і дакаралі памылкамі ў маўленні. А зараз мы з Алесяй робім тое самае, і, можа, студэнты крыўдуюць, але пераканаюць, што гэта ідзе ім толькі на карысць.



Ты глядзіш на звычайныя рэчы, якія бачыў шмат разоў, чуеш тое, што чуў раней, і дакладна ведаеш, што нічога незвычайнага ў іх няма, і раптам нешта шчоўкае, і ты разумееш, што гэта кавалак з новага спектакля

— Удзельнікамі тэатра могуць быць толькі студэнты?

Алеся Сівохіна: Былі прыклады, калі ў тэатры займаліся і школьнікі, і навучэнцы каледжаў, і выпускнікі ўніверсітэтаў. Але тэатр — жывы арганізм, які трансфармуе асяроддзе і разуменне, саманастройваецца: людзі, якія прыходзілі сюды, ужо працуючы, на маёй памяці, доўга не заставаліся. З розных прычын. Тэатр фільтруе людзей, каб падтрымліваць студэнцкую атмасферу: калі чалавек не ўпісваецца ў яе, то ён адчувае гэта. Не ўсе вытрымліваюць рытм размінак і рэпетыцый два разы на тыдзень. Выступленні таксама вымагаюць адрывацца ад любых спраў, што вельмі няпроста зрабіць, калі ты працуеш. А калі не ездзіш на выступленні з тэатрам, выбіваешся з рытму калектыву.

Алесь Мойскі: Калі ў асобе яшчэ жыве студэнт, то яна лёгка ўпішацца ў нашу атмасферу, але мы не тэатральная трупа ў класічным яе азначэнні, а хутчэй калектыў аднадумцаў, сям'я, дзе на першым плане ўзаемаразуменне і давер. Студэнт заўсёды ў пошуку, а сталы чалавек са сфарміраванымі поглядамі на жыццё ці школьнік са сваімі інтарэсамі хутчэй за ўсё адчуе сябе чужынцам у такім калектыве.

— Што вы шукаеце ў сваіх вучнях?

Алеся Сівохіна: Калі вы назвалі іх вучнямі, то мы, напэўна, настаўнікі. Кожны настаўнік шукае ў вучнях сябе, глядзіць на іх, як на сябе, і хоча, каб яны былі лепшымі, больш дасканалымі і дасягнулі ў самаразвіцці таго, чаго не змог дасягнуць настаўнік. Прынамсі, мне б так хацелася.

Ёсць людзі, якія займаліся тэатрам у школе, яны больш падрыхтаваныя для таго, каб выйсці на сцэну і нешта зрабіць. Ёсць людзі, якія баяцца гледачоў. Не магу сказаць, што з імі даводзіцца больш працаваць, бо працаваць даводзіцца ім. Я не магу навязаць ім сваё разуменне, уставіць свае думкі ў іх галаву. Ім даводзіцца праходзіць самім праз гэта выпрабаванне, выкарыстоўваючы ці адмаўляючы мае парады. Калі не выкарыстоўваць — працэс пойдзе даўжэй, але ўсё адно яны даходзяць да

Самае страшнае — гэта абыякавасць да таго, што ты робіш

гэтага самі. Не бывае такога, што я магу зрабіць, каб чалавек раптам пачаў камфортна сябе адчуваць.

Алесь Мойскі: А часам даводзіцца штучна ствараць дыскамфортную сітуацыю, каб наўмысна выклікаць у студэнтаў пачуцці, якіх па-іншаму не дабіцца ў звычайным жыцці, бо на рэпетыцыі кожны прыходзіць са сваімі думкамі, праблемамі… Тэатр прымушае забыцца на ўсё і атрымліваць задавальненне ад творчага працэсу.

Мы чакаем ад студэнтаў, у першую чаргу, водгук. Шчыры водгук на тое, што прапануем. Нават калі яны не згодныя з матэрыялам, над якім мы працуем, падыходамі, што абіраюцца намі, хочацца, каб вучань шчыра выказаўся і патлумачыў сваю пазіцыю. Бо нашы вучні — гэта дарослыя людзі са сваімі ідэямі, поглядамі. Самае страшнае — гэта абыякавасць да таго, што ты робіш. Вось яе мы дакладна не шукаем!

— Як праходзяць вашы заняткі?

Алеся Сівохіна: Прыходзяць студэнты, пераапранаюцца і ідуць на размінку. Размінка складваецца з фізічнага трэнінгу — практыкаванняў, каб разагрэць свае мышцы, і трэнінгу моўна-галасавога, дзе развіваецца дыханне і голас. Размінка можа быць даволі працяглай — ад гадзіны да двух, калі мы ўключаем акцёрскія і псіхалагічныя трэнінгі. Пасля гэтага ідзём рэпеціраваць тое, што актуальна.

Алесь Мойскі: Актуальнай можа быць літаратурна-музычная кампазіцыя па творах якога-небудзь паэта-юбіляра, як у мінулым годзе мы рыхтаваліся да 120-годдзя Кандрата Крапівы і 125-годдзя Максіма Багдановіча. Гэта можа быць канцэртная праграма, складзеная з глыбокадумных вершаў, лірычных песень і сатырычных мініяцюр, якую мы рыхтуем для школ, бібліятэк, музеяў, куды нас вельмі часта запрашаюць. Зараз мы працягваем працаваць над спектаклем «Дудар», прэм'ера якога адбылася 1 лістапада 2016 года. Гэта дакументальная фантазія, заснаваная на гістарычных фактах з культурнага жыцця беларусаў пачатку XX стагоддзя, на эпісталярнай спадчыне, успамінах, публіцыстыцы і мастацкіх творах Сяргея Палуяна, алюзіях і рэмінісцэнцыях на творы Вацлава Ластоўскага, Франца Кафкі, Хорхе Луіса Борхеса.

— Наколькі акцёры ўплываюць на рэпертуар?

Алеся Сівохіна: Калі ставім спектакль, то цікавімся меркаваннямі акцёраў, але ад пачатку гэта наша з Алесем праца. З іншага боку, у іх ёсць магчымасць паказаць, што яны назапасілі самі за год, чаму навучыліся. Яны арганізуюць вечарыну ўласнай творчасці «Атрасіны» напрыканцы восені. Як дрэва атрасае лісце, так яны атрасаюць свае думкі, ідэі, прыносяць, што яны хацелі паказаць: ладзяць ці канцэрт, ці вечарыну, ці спектакль. З гэтых нумароў папаўняецца канцэртная праграма, ці вырастае нават спектакль.

Калі спектакль падыходзіць да самастойнага жыцця — калі мы адчуваем, што ён ужо не наш, а пераходзіць да акцёраў, яны дадаюць нюансы, і ён жыве на сцэне, а мы ўплываем толькі на нейкія тэхнічныя дэталі, у такія моманты ў мяне пачынаюць нараджацца думкі пра новую працу — такія, якія не даюць спакойна спаць, турбуюць, сняцца начамі. Тады пачынае вымалёўвацца новая ідэя — ты глядзіш на звычайныя рэчы, якія бачыў шмат разоў, чуеш тое, што чуў раней, і дакладна ведаеш, што нічога незвычайнага ў іх няма, і раптам нешта шчоўкае, і ты разумееш, што гэта кавалак з новага спектакля. Самае цікавае, што ў нас з Алесем гэта адбываецца на падобныя рэчы: напрыклад, я прыношу нейкі запіс, распавядаю, якія ў мяне ідэі, і ён кажа, што ў яго ўзнікалі падобныя думкі.

Алесь Мойскі: Напрыклад, наш новы спектакль «Дудар» аб'яднаў такія агульныя думкі і ідэі, першапачаткова меў мноства неразвітых тэм і адгалінаванняў ад іх. Прыадкрыю творчую майстэрню, але мы выкарысталі творы вышэйназваных аўтараў для сюжэтнай лініі, якую стварылі самі. Для гэтага нам з Алесяй давялося адмовіцца ад некаторых другасных тэм і пакінуць асноўныя. Калі студэнты пачалі працаваць над спектаклем, то ў некаторых месцах яны па-свойму расставілі акцэнты, і на першы план выйшлі новыя праблемы, як, напрыклад, існаванне мастацтва за грошы для матэрыяльнага забеспячэння ці дзеля таго, каб пакінуць годную спадчыну дзецям і ўнукам.

— Ці ёсць у вас прыклад для працы на сцэне?

Алеся Сівохіна: У акцёраў, напэўна, ёсць свае прыклады. Я вельмі асцярожна стаўлюся да прыкладаў і параўнанняў. Калі ты параўноўваеш сябе з кімсьці, ты заўсёды ў мінусе, бо ніколі не будзеш іншым чалавекам, будзеш толькі сабой. Самае аптымальнае — шукаць крыніцы развіцця ў сабе і параўноўваць сябе з сабой: якім я быў, наколькі вырас і стаў лепшым, па сваіх крытэрыях.

Алесь Мойскі: Як казаў дзядзька Шэкспір, усе людзі — акцёры. Таму лепшыя прыклады для працы на сцэне я параіў бы шукаць у жыцці. Быць больш назіральным і ўважлівым, бо часам сыграць так, як могуць цётачкі ў крамах і транспарце пры безбілетным праездзе, не зможа ніводны прафесійны акцёр. Усё жыццё не будзеш капіраваць куміраў тэатра і кіно — трэба шукаць сябе. Нам, як кіраўнікам, таксама варта памятаць, што мы можам стаць прыкладам для студэнтаў, таму і ў жыцці, і на сцэне я спрабую трымаць сябе годна і не ісці ў разрэз са сваімі поглядамі і маральнымі прынцыпамі. Я паважаю сваіх вучняў, хвалю за поспехі і буду дакараць за правіны. У гэтым плане для мяне прыкладам служаць мае настаўнікі і бацькі, якія не маюць нічога агульнага з прафесіяй акцёра.

Часам сыграць так, як могуць цётачкі ў крамах і транспарце пры безбілетным праездзе, не зможа ніводны прафесійны акцёр

